# МАЦЕРЫКІ І АКІЯНЫ.



# Мацерыкі або кантыненты




- Зямля мае форму шара.
- Больш цёмныя ўчасткі – гэта вада, а светлыя – суша. На сінім фоне акіянаў яркімі плямамі выступаюць велізарныя ўчасткі зямной сушы – мацерыкі або кантыненты.

**Кантынентаў шэсць: Афрыка, Еўразія, Аўстралія, Антарктыда, Паўночная Амерыка, Паўднёвая Амерыка**

# Чатыры акіяны

Большая частка Зямлі пакрыта вадою, якая ўтварае Сусветны акіян. Кантыненты і астравы дзеляць яго на чатыры акіяны




Ціхі акіян- самы вялікі, Атлантычны- выцянуты з поўначы на поўдзень, самы маленькі і халодны- Паўночны Ледавіты акіян і Індыйскі акіян

# Часткі свету

Вялікія ўчасткі зямлі разам з выспамі называюць часткамі свету. Частак свету таксама шэсць: Еўропа, Азія, Афрыка, Амерыка, Аўстралія, Антарктыда.

Гэта дзяленне таксама культурна-гістарычнае.



# Еўразія

- Гэта самы вялікі кантынент. Еўразія абмываецца чатырма акіянамі зямнога шара і размешчана ва ўсіх геаграфічных паясах Паўночнага паўшар'я.
- Свет раслін і жывёл разнастайны.
- Кантынент дзеліцца на две часткі свету: Еўропу і Азію.





# Еўропа











- На гэтым маленькім кавалачку зямлі знаходзіцца больш за 40 краін, народы якіх кажуць на дзясятках моў. Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы

- Найбуйнейшая выспа Еўропы – Вялікабрытанія.
- Найбуйнейшае возера Еўропы – Ладажскае.
- Самая доўгая рака – Волга.

# Азія









- Азія — самая вялікая частка свету, утварае разам з Еўропай мацярык Еўразію. На тэрыторыі Азіі размешчана 54 дзяржавы.

У Азіі жывуць прадстаўнікі трох галоўных рас чалавецтва — манголоіднай, еўрапеоіднай і нягроіднай.

# Азія



Возера Байкал – самае глыбокае возера планеты Зямля.



Кітай - найбуйнейшая па колькасці насельніцтва дзяржава свету.



Каспійскае мора — найбуйнейшае возера свету.



Найвышэйшая гара свету Джамолунгма або Эверэст

# Афрыка







Гэта другі па велічыні мацярык пасля Еўразіі. Насельніцтва Афрыкі складае каля мільярда чалавек.

Гэта самы гарачы кантыненты. Тут ёсць і прыгожыя экватарыяльныя лясы, і раўнаны з баабабамі.  Тут знаходзіцца самая вялікая пустыня Сахара.

# Афрыка







Нідзе ў свеце не засталося столькі буйных дзікіх жывёл. Тут водзяцца гарылы і шымпанзэ, а ў водах ракі Ніл– кракадзілы. У саванах жывуць антылопы, зебры, жырафы, сланы, ільвы, гепарды, гіены



- Ніл - адна з двух найвялікіх па працягласці рэк у свеце.



Егіпецкія піраміды - уяўляюць сабою велізарныя каменныя збудаванні, якія выкарыстоўваліся ў якасці магіл для фараонаў Старажытнага Егіпту.

# Аўстралія









- Гэта самы незвычайны мацярык зямнога шара.
- На ім мясцуецца толькі адна дзяржава– Аўстралія.
- Гэта самы маленькі кантынент, а таксама самы сухі. Але тут ёсць дрэвы, якія не сустракаюцца на іншых мацерыках: эўкаліпт і бутэлькавае дрэва

- Дзіўны жывёльны свет Аўстраліі. Гэта царства сумчатых жывёл: вавёркі, пацукі, каала, кенгуру.
- Толькі тут сустракаюцца качканос і яхідна.

# Паўночная Амерыка







- Вялікую частку гэтага мацерыка займаюць 2 краіны, якія ўваходзяць у дзясятку самых развітых на нашай планеце, - ЗША і Канада.

Толькі ў Паўночнай Амерыцы можна сустрэць бізона і скунса. Мексіка – радзіма шматлікіх кактусаў.

# Паўночная Амерыка



Гара Рашмор - у ёй высечаны гіганцкі барэльеф з партрэтамі чатырох прэзідэнтаў ЗША



Вялікі Каньён – гэта разнастайнасць скал і пячор, выпрацаваны ракой Каларада ў тоўшчы зямлі



Секвоя – адно з самых высокіх дрэў на Зямлі. Іх вышыня можа дасягаць больш за 110 метраў.



Амерыка славіцца сваімі хмарачосамі

# Паўднёвая Амерыка





- Гэта самы дажджлівы кантынент. Тут ёсць і вільготныя лясы з яркімі птушкамі і малпамі, і бязмежныя травяністыя раўніны. Ён падобны да Афрыкі , але тут значна менш пустынь і значна больш гор.

- Паўночная і Паўднёвая Амерыка размешчаны на Заходнім паўшар'і па абодва бакі ад экватара і утвораюць адну частку света- Амерыка





- Амазонка - самая доўгая і паўнаводная рака свету. Яе даўжыня – 7100 км. У ёй жывуць драпежныя рыбы – піранні.



У Паўднёвай Амерыцы працягнуліся самыя доўгія горы – Анды.



Вадаспад Анхель - самы высокі ў свеце вадаспад, агульная вышыня - 979 метраў.

# Антарктыда







- Антарктыда – кантынент, размешчаны на самым поўдні Зямлі. Гэта самы халодны мацярык. У Антарктыдзе распасціраюцца снежныя раўніны, якія мяжуюць з хрыбтамі гор.

- З наземных жывёл жывуць цюлені, імператарскія пінгвіны, марскія леапарды і паморнікі.
- Антарктыда не прыналежыць ніводнай дзяржаве. Дазволена толькі навуковая дзейнасць і там размешчаны навуковыя станцыі.